■ У новым фармаце

# РЭШТКІ, РЭГЛАМЕНТ І ТЭРМІНАЛЫ

## Менш чым праз месяц у краіне завяршаюцца адразу тры «пераходныя перыяды» для прадпрымальнікаў



**Днямі ў сталіцы адбылося пасяджэнне грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве эканомікі Беларусі пад старшынствам намесніка міністра эканомікі Ірыны КАСЦЕВІЧ.**

На гэты раз у мерапрыемстве прымалі ўдзел не толькі чыноўнікі ад галіновых міністэрстваў, але і прадстаўнікі Нацыянальнага банка, Вярхоўнага Суда, Дзяржстандарта, а таксама лідары прадпрымальніцкіх саюзаў, адпаведных канфедэрацый і асацыяцый прадпрымальніцтва, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі са сталіцы і рэгіёнаў, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Мінэканомікі.

Ужо ў самым пачатку савета прадпрымальнікі атрымалі магчымасць агучыць усе праблемныя пытанні, а прадстаўнікі дзяржорганаў — Міністэрства па падатках і зборах, Дзяржстандарта і Нацбанка — у сваіх выступленнях адказалі на іх. Большасць пытанняў тычылася ўмоў працы індывідуальных прадпрымальнікаў з першых дзён 2016 года.

### АПОШНІЯ ДНІ ДЛЯ «РЭШТКАЎ»

Чыноўнікі ад улады нагадалі прысутным, што менавіта з гэтай даты заканчваюцца адразу тры «пераходныя перыяды».

Па-першае, з новага года спыняецца гандаль «рэшткамі» — так званымі таварамі лёгкай прамысловасці, якія былі ўвезены на тэрыторыю нашай краіны без суправаджальных дакументаў да 1 ліпеня 2014 года. Нагадаю, што з гэтай даты гандляваць без дакументаў забаранілі (Указам Прэзідэнта ад 16.05.14 № 222), але на распродаж ранейшых запасаў тады далі ўсяго 1,5 года. Атрымліваецца, што «пераходны перыяд» па такіх рэштках у прадпрымальнікаў доўжыўся амаль 18 месяцаў. Спецыялісты адзначылі, што снежань стаў апошнім месяцам да знакавай даты. Цяпер тым, хто не паспее ўсё распрадаць, застанецца толькі выкарыстоўваць гэтыя тавары для сябе — яны павінны быць выведзены з прадпрымальніцкага абарачэння.

### ТЭХРЭГЛАМЕНТ АБАВЯЗКОВЫ ДЛЯ ЎСІХ

Па-другое, у студзені ўсе тавары легпрама павінны ў поўнай меры адпавядаць тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза 017/2011 «Аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці» і, такім чынам, мець аб'ектыўную інфармацыю аб вытворцы, імпарцёры, спажывецкіх уласцівасцях і неабходныя дакументы аб пацвярджэнні бяспекі. Фактычна тэхрэгламент і адпаведнае нацыянальнае заканадаўства на тэрыторыі нашай дзяржавы дзейнічаюць ужо некалькі гадоў, але прадпрымальнікам было дазволена не выконваць гэтыя правілы ў поўным аб'ёме ці нават нагул не выконваць іх, праўда, папярэдзіўшы спажыўца пра гэта. Такія правілы «гульні» на рынку таксама былі вядомыя ўжо даўно.

### З КАРТКАЙ — ДА ПРАДПРЫМАЛЬНІКА І Ў ТАКСІ

Па-трэцяе, з першых дзён новага года ўсе індывідуальныя прадпрымальнікі ў Мінску і гарадах абласнога падпарадкавання, адначасова з прадпрымальнікамі гарадоў раённага падпарадкавання, у сваіх гандлёвых аб'ектах (а таксама ў аб'ектах бытавога абслугоўвання і ў таксі) абавязаны ўсталяваць і выкарыстоўваць плацежныя тэрміналы. Так, гэта такія тэхнічныя прылады, якія дазваляюць прымаць аплату банкаўскімі карткамі. Згодна з сумеснай пастановай урада і Нацбанка (ад 6 ліпеня 2011 года № 924/16), гэта павінна было адбыцца 1 ліпеня 2015 года, але ў выніку прадпрымальнікам Мінска і гарадоў абласнога падпарадкавання далі паўгадавую адтэрміноўку.

**Калі ў 2014 годзе каля 40 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў рэалізоўвалі такія «рэшткі», то сёння іх засталося менш за 13 тысяч чалавек.**

### КРОПКІ РАССТАЎЛЕНЫ

Выкарыстанне схем адтэрміноўкі і «пераходных перыядаў» уладамі для прадпрымальнікаў тлумачылася разуменнем аб'ектыўных складанасцяў для апошніх. Сапраўды, цяпер індывідуальным прадпрымальнікам неабходна было займацца пошукам новых добрасумленных пастаўшчыкоў, праверкай тавараў або, як у выпадку з тэрміналамі, — вырашаць праблему з дадатковымі выдаткамі на набыццё адпаведнага абсталявання.

У прэс-службе Мінэканомікі адзначылі, што большая частка індывідуальных прадпрымальнікаў скарысталася прадастаўленым часам па прызначэнні. Так, калі ў 2014 годзе каля 40 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў рэалізоўвалі такія «рэшткі», то сёння іх засталося, па ацэнцы спецыялістаў, менш за 13 тысяч чалавек. Разам з тым практыка пераносаў і адтэрміновак цалкам не вырашала праблему. Па заканчэнні тэрміну іх дзеяння заставаліся і застаюцца індывідуальныя прадпрымальнікі, не гатовыя да функцыянавання ў новых умовах.

Цяпер яны выступаюць за дазвол гандляваць «рэшткамі» аж да поўнага распродажу, а плацежныя тэрміналы ўсталёўваць па жаданні прадпрымальнікаў. Іншымі словамі, гаворка ідзе аб прапановах па яшчэ адной змене заканадаўства. У прыватнасці было выказана пажаданне вярнуцца да фармату працы ў рамках Указа Прэзідэнта № 285 ад 18.06.2005 года.

Разам з тым індывідуальнымі прадпрымальнікамі быў узняты шэраг практычных пытанняў, звязаных з выкананнем існуючых нормаў. Напрыклад з устаноўкай і абслугоўваннем банкамі плацежных тэрміналаў, практыкай праверкі сапраўднасці дакументаў, што прадастаўляюцца контрагентамі ў Расійскай Федэрацыі і практыкай прымянення адміністрацыйнай адказнасці за працу з дакументамі, прызнанымі не адпаведнымі рэчаіснасці.

Намеснік міністра эканомікі Ірына Касцевіч падкрэсліла важнасць мінулага пасяджэння ГКС як дыялогавай пляцоўкі дзяржорганаў і індывідуальных прадпрымальнікаў і падзякавала прадстаўнікам прадпрымальніцтва за грунтоўную падрыхтоўку. Яна адзначыла, што ўсе названыя практычныя праблемы і прапановы знойдуць сваё адлюстраванне ў выніковым пратаколе пасяджэння, і папрасіла прадстаўнікоў дзяржорганаў у самыя кароткія тэрміны падрыхтаваць прапановы па іх вырашэнні.

Напрыклад, абмеркаванне практычных праблем, звязаных з плацежнымі тэрміналамі (у тым ліку спосабаў іх устаноўкі, тарыфаў абслугоўвання і хуткасці залічэння грашовых сродкаў на рахункі) будзе ініцыявана ў найбліжэйшы час у межах міжведамаснага савета пры Нацбанку. Па словах намесніка міністра гандлю Ірыны Наркевіч, важна вырашаць гэтыя пытанні з улікам інтарэсаў усіх бакоў — пакупнікоў, прадпрымальнікаў і банкаўскай сістэмы, і ў сувязі з гэтым будзе карысна вывучыць літоўскі і латвійскі вопыт.

**Тым, хто не паспее ўсё распрадаць, застанецца толькі выкарыстоўваць гэтыя тавары для сябе — яны павінны быць выведзеныя з прадпрымальніцкага абарачэння.**

Падчас пасяджэння прадстаўнікі бізнесу таксама выказалі прапанову аб стварэнні пры грамадска-кансультатыўным савеце пры Мінэканомікі пастаяннай групы па абмеркаванні пытанняў дзейнасці выключна індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэта прапанова была падтрымана саветам.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# У БАНК, ЯК НА ПРАЦУ?

### Рахункі — плюс, іпатэка — мінус

Як сведчаць звесткі апошняга апытання, найбольш распаўсюджанымі сярод насельніцтва фінансавымі паслугамі з'яўляюцца бягучы банкаўскі рахунак і дэбетавая картка. Цяпер імі карыстаецца звыш 85% грамадзян (50% падчас мінулага даследавання). У групу найбольш запатрабаваных паслуг увайшлі таксама інтэрнэт-банкінг і страхаванне аўтатранспартных сродкаў.

Выканаўцы даследавання адзначаюць, што больш за ўсё жыхары краіны ахоплены разліковa-касавымі паслугамі — 85% (у 2012-м — 69,5%). Далей ідуць паслугі страхавання — 55%, амаль на тым жа ўзроўні, што і тры гады таму. Людзі страхуюць не толькі аўто, але і іншую ўласнасць. На трэцім месцы — крэдытныя паслугі. У 2012-м імі карысталася 18% насельніцтва, а цяпер 24,6%. Сярод паслуг крэдытавання лідзіруюць крэдыты на спажывецкія патрэбы (54,1%). Другі па папулярнасці — крэдыт на рамонт жылога памяшкання.

«Найменш папулярныя ў беларусаў акцыі, крэдыты на набыццё аўтатранспартных сродкаў, пазыкі крэдытных кааператываў, крэдыты на адукацыю і на сельскагаспадарчыя патрэбы, дэпазітныя сертыфікаты і іпатэка — гэтымі паслугамі карыстаюцца менш за 5% апытаных», — расшыфроўвае табліцы даследавання **загадчыца сектара метадыкі і практыкі прыкладных сацыялагічных даследаванняў Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Святлана КРОЙТАР.**

### Уклады, а не акцыі

Апытанне паказала, што беларусы дастаткова актыўна і зберагаюць свае сродкі. Для гэтага наша насельніцтва часцей за ўсё карыстаецца ашчаднымі рахункамі (66,1%) і тэрміновымі дэпазітамі (25,1%). Акцыі і іншыя інструменты зберажэння і інвеставання ў жыхароў краіны не ў пашане.

**Даведка «Звязды»**

*Другое даследаванне, названае «Ацэнка і аналіз доступу насельніцтва да фінансаў у Рэспубліцы Беларусь», праводзілі спецыялісты дзяржаўнай установы «Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Было апытана насельніцтва краіны ва ўзросце ад 18 гадоў. Агульны аб'ём выбаркі склаў 2500 рэспандэнтаў з усіх абласцей краіны.*

*Такія даследаванні робіцца ў межах сумеснага праекта Нацыянальнага банка Беларусі і Альянса за фінансавую даступнасць.*

### Багаты, жанаты і з вышэйшай адукацыяй

Эксперты Інстытута сацыялогіі па выніках даследавання «намалявалі» і прыкладны партрэт ідэальнага карыстальніка фінансавымі паслугамі.

Па-першае, гэта мужчына. Менавіта яны, як правіла, карыстаюцца вялікай колькасцю фінпаслуг. Гэта, хутчэй за ўсё, звязана з тым, што мужчыны часцей за ўсё і прымаюць фінансавыя рашэнні ў сям'і. А яшчэ ён жанаты, з добрай адукацыяй, старэйшы за 25 гадоў, са стабільнай працай і высокім сацыяльным становішчам. Менавіта чалавек з сур'ёзнымі даходамі і вялікай сям'ёй павінен добра разбірацца ў фінансавых прадуктах і сучасных банкаўскіх паслугах, інакш яму прыйдзецца хадзіць у банк, як на працу.

Як адзначыла Святлана Кройтар, фінансавая актыўнасць насельніцтва сур'ёзна залежыць ад сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык рэспандэнтаў. У прыватнасці, даволі маладыя (да 25 гадоў) і старшыя (66 гадоў і больш за) узроставыя групы, з нізкім узроўнем адукацыі, невысокім сацыяльным становішчам, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і не маюць пастаяннага месца працы і стабільнага даходу, вызначаюцца прыкметна больш нізкім узроўнем выкарыстання фінансавых паслуг ад прадстаўнікоў астатніх груп насельніцтва.

### Зазірнуць за гарызонт

«Дынаміка з пункту гледжання фінансавай даступнасці ў нас станоўчая — расце ўцягнутасць грамадзян у выкарыстанне фінансавых паслуг», — адзначыў намеснік кіраўніка Нацбанка. Ён дадаў, што фарміраванне стабільнага і моцнага фінансавага рынку — адзін з найважнейшых напрамкаў дзейнасці рэгулятара. «У сувязі з гэтым даступнасць фінансавых паслуг для ўсіх суб'ектаў эканамічных адносін з'яўляецца найважнейшай тэмай, якую мы рэалізуем сумесна з Альянсам за фінансавую даступнасць», — паведаміў Сяргей Калечыц.

Прадстаўнік рэгулятара звярнуў увагу, што адпаведныя даследаванні маюць сур'ёзнае практычнае значэнне для далейшых дзеянняў пры правядзенні грашова-крэдытнай палітыкі краіны. «Вынікі даследаванняў будуць выкарыстоўвацца Нацбанкам у сваёй дзейнасці па развіцці фінансавага рынку, паляпшэнні доступу да фінансаў і павышэнні фінансавай асветы насельніцтва», — падкрэсліў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


# ОАО «Белбакалея»

**извещает, что 22 декабря 2015 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белбакалея» по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**

**Регистрация участников собрания с 13.00.**

При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1. О внесении изменений и дополнений в условия крупной сделки (взаимосвязанных сделок) с ЗАО «Альфа-Банк».**

**2. О передаче полномочий на решение Наблюдательного совета ОАО «Белбакалея».**

***Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»***

УНП 100025653

Наблюдательный совет

# ОАО «Белхозторг»

**ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА**

**Собрание состоится 22 декабря 2015 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 34, к. 401 (4-й этаж).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О даче согласия на подготовительную стадию инвестиционного проекта «Возведение здания склада по адресу: Минский район, Щомыслицкий с/совет, д. Озерцо, Менковский тракт, 14» в части разработки предпроектной (предынвестиционной) документации.

С информацией, подлежащей рассмотрению на внеочередном общем собрании акционеров, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Платонова, 34, 4-й этаж.**

Регистрация участников собрания состоится 22 декабря 2015 года с 11.00 до 11.55 по месту проведения собрания.

Дата составления списка акционеров 09 декабря 2015 года.

Для регистрации при себе иметь:

- акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера Общества – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100230626

*Наблюдательный совет ОАО «Белхозторг»*